UZUPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD

PESEL

*miejsce na naklejkę*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **24 maja 2017 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **9:00**
CZAS PRACY: **170 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

UZUPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY

Uprawnienia ucznia do:

☐ dostosowania kryteriów oceniania

NOWA FORMUŁA

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron (zadania 1–11). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-P1_1P-172

Układ graficzny
© CKE 2015

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 1.–5.**

Наталля Пан

***Быць свабодным***

Наша свабода належыць да тых здабыткаў, з якімі мы нараджаемся і з якімі паміраем, мы не ў стане штосьці змяніць у натуральным парадку рэчаў. Усе мы валодаем прыроджанай і пажыццёвай свабодаю распараджацца сабою, сваім жыццём. Няўжо? – можаце здзівіцца вы. – А як жа наша штодзённая залежнасць: патрэбы блізкіх, начальнік-дыктатар, эканамічная сітуацыя, здароўе?

Чалавечая свабода прадугледжвае менавіта магчымасць выбіраць, але што і калі мы называем выбарам у нашым паўсядзённым жыцці? Ці можна лічыць выбарам сітуацыю, калі ў нас ёсць толькі два варыянты? Сапраўдны выбар у жыцці чалавека з'яўляецца тады, калі ў абодвух варыянтах, на абедзвюх шалях вагаў, знаходзіцца аднолькавая колькасць плюсаў і мінусаў.

Выбар здзяйсняецца звычайна ў некалькіх этапах. Першы этап – гэта яснае ўсведамленне сваіх жаданняў. Мець жаданні, а тым больш разумець іх – занятак даволі рызыкоўны: калі не ўдаецца атрымаць тое, чаго мы моцна прагнулі, перажыванні і горыч непазбежныя. Менавіта таму многія з нас несвядома блакуюць сваю магчымасць выбіраць, адмаўляюцца ад свабоды ўжо на першым этапе.

Логіка ў дадзеным выпадку простая: лепш ні пра што не думаць і нічога не чакаць, не марыць, тады не будзе балюча, калі не здзейсніцца, і будзе прыемна, калі ўсё ж такі „пашанцуе". Вось і атрымліваецца, што жыццё мінае, а мы скардзімся на яго аднастайнасць, шэрасць, прадказальнасць і адсутнасць усялякай свабоды выбару.

Другі этап выбару – аналіз наступстваў. Па якім шляху пайсці, за якім жаданнем? Дзеля справядлівасці варта заўважыць, што ў кожнага з нас заўсёды ёсць некалькі жаданняў, і часта ўзаемавыключальных.

З'яўляючыся дарослымі людзьмі, мы пералічваем набыткі і страты кожнага з варыянтаў. Адмаўляемся ад аналізу і атрымліваем „нечаканыя" негатыўныя наступствы, вінавацячы атачэнне, а нярэдка і Бога ў жорсткасці, несправядлівасці і дэспатызме. Заставацца вечна наіўнымі і інфантыльнымі „дарослымі дзецьмі" – вось яшчэ адзін пашыраны спосаб ігнаравання сваёй свабоды.

Паводле: http://catholic.by

**Заданне 1. (0–1)**

Чым для аўтаркі тэксту з'яўляецца свабода? Пазнач правільны адказ.

А. Магчымасць дзейнасці.
Б. Абавязак падпарадкавання.
В. Магчымасць выбару.
Г. Адсутнасць прымýсу.

**Заданне 2. (0–1)**

Словы „пашанцуе”, „нечаканыя” і „дарослымі дзецьмі” ўзяты ў двукоссе, таму што гэта:

А) словы іншамоўнага паходжання.
Б) словы ў пераносным значэнні.
В) апорныя словы тэксту.
Г) словы высокага стылю.

**Заданне 3. (0–1)**

Растлумач, як разумееш погляд аўтаркі артыкула: „ Мець жаданні, а тым больш разумець іх – занятак даволі рызыкоўны: калі не ўдаецца атрымаць тое, чаго мы моцна прагнулі, перажыванні і горыч непазбежныя”. (3 абзац)

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 4. (0–1)**

На аснове цэлага артыкула адкажы, праўда гэта ці фальш. Адказ пазнач адпаведнымі літарамі: П (праўда), Ф (фальш).

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Варта сабе ўсведамляць, што не ўсе людзі гатовыя карыстацца свабодай выбару. | **П** | **Ф** |
| **2.** | Аўтарка артыкула падкрэслівае, што свабода выбару найчасцей балансуе паміж добрым – дрэнным, карысным – бессэнсоўным. | **П** | **Ф** |
| **3.** | Аўтарка артыкула падкрэслівае, што не варта аналізаваць свае выбары, а варта аддацца волі лёсу. | **П** | **Ф** |

**Заданне 5. (0–1)**

Складзі па аднаму пытанню да:

2 абзаца – .............................................................................................................................

6 абзаца – .............................................................................................................................

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 6.–10.**

Марыя Кірава

***Стэрэатыпы пра вывучэнне моў: кропкі над „і”***

Я вырашыла падзяліцца найбольш частымі міфамі пра вывучэнне моў і аспрэчыць іх. Некаторыя з іх настолькі ўкараніліся, што да гэтага часу падаюцца праўдай у апошняй інстанцыі. […]

Трэба прысвячаць больш часу замежнай мове, родная нікуды не падзенецца.
Зыходзячы з вопыту, магу дакладна сказаць: яшчэ як падзенецца. І добра, калі веды замежнай мовы будуць адпаведна добрымі, бо можна і сваю згубіць, і замежную не вывучыць. Мне давялося размаўляць з тымі, хто пераехаў на ПМЖ[1] пару гадоў таму. Гэтага часу ім хапіла, каб адвыкнуць размаўляць без памылак і адразу знаходзіць патрэбныя словы. Што адбываецца з тымі, хто з’ехаў дзесяцігоддзі таму і амаль не выкарыстоўваў родную мову, можна не казаць. Ці можа здарыцца нешта падобнае на радзіме? Можа, калі чалавек атачае сябе выключна іншамоўным асяроддзем ці пастаянна працуе ў ім. Таму не варта пагарджаць сваёй культурай. Добры фільм ці кніга на роднай мове дапамогуць цікава бавіць час і падтрымліваць веды на ўзроўні. […]

Той, хто жыў у краіне вывучаемай мовы, выдатна валодае ёй…
…калі прыкладаў намаганні вывучыць яе. […] „Сама” мова вывучыцца толькі ў дзіцячым узросце і толькі на працягу пэўнага часу. Дарослыя ўжо ўспрымаюць усё праз прызму сваёй роднай мовы, таму ім складаней успрыняць іншую.

Вывучыць мову самастойна немагчыма.
У наш час інтэрнэту самастойна нельга вывучыць толькі нейкую занадта экзатычную мову вельмі далёкай краіны, носьбітаў якой можна пералічыць па пальцах. Анлайн-курсы, відэа, падкасты, форумы, інтэрактыўныя практыкаванні, аўдыёкнігі – толькі лянівы не карыстаецца такой разнастайнасцю. Канешне, самастойнае навучанне патрабуе дысцыпліны і паслядоўнасці, ды і напачатку складана знайсці менавіта “сваю” методыку. Сапраўды, самастойнае навучанне складаней, але хто хоча, той дабіваецца пастаўленых мэтаў. Некаторым лягчэй займацца з настаўнікам індывідуальна ці ў групе, што, аднак, з’яўляецца асновай і не адмяняе неабходнасць самастойнай працы.

Носьбіт мовы – найлепшы настаўнік.
Напэўна, некаторыя з вас маюць знаёмых замежнікаў, якія вывучаюць вашу родную мову. Часам яны могуць задаваць такія пытанні, што нават адразу і не адкажаш. Чаму ў нашай мове нешта так, а не гэтак? А хто яго ведае, чаму… Бо ўсе так кажуць! Знаёмая сітуацыя? Справа ў тым, што носьбіты мовы часцей за ўсё не ўсведамляюць сваю мову як складаную сістэму. Ім гэта і не патрэбна, бо яны вольна валодаюць ёй, для іх яна толькі інструмент. Каб нешта даходліва патлумачыць, трэба добра разумець з’яву і ўмець гаварыць проста пра складанае. Таму далёка не кожны носьбіт мовы можа быць добрым настаўнікам, як і не кожны добры настаўнік – носьбіт мовы.

http://adukacyja.info

[1] ПМЖ – пастаяннае месца жыхарства.

**Заданне 6. (0–1)**
Пазнач згодна з інфармацыяй, пададзенай у тэксце. Падкрэслі ТАК, калі інфармацыя адпавядае тэксту, НЕ – калі не адпавядае.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Роднай мовай людзі заўсёды валодаюць беспамылкова; гэта незабыўная мова. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Інтэрнэт дапамагае ў самастойнай навуцы. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Носьбіт мовы заўсёды з'яўляецца добрым настаўнікам. | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 7. (0–2)**
а) У якім стылі напісаны тэкст *Стэрэатыпы пра вывучэнне моў: кропкі над „і"*? Пазнач правільны адказ.

А) навуковым
Б) афіцыйна-дзелавым
В) публіцыстычным
Г) мастацкім

б) Падай дзве характэрныя асаблівасці гэтага стылю.

1) ..........................................................................................................................................

2) ..........................................................................................................................................

**Заданне 8. (0–1)**
Ад назоўнікаў утвары прыметнікі:

А) мова – ..............................................................................................................................

Б) вопыт – ............................................................................................................................

В) памылка – ........................................................................................................................

**Заданне 9. (0–1)**
Пазнач значэнне, у якім слова *міф* выступае ў тэксце.

1) Старажытнае народнае паданне аб паходжанні свету і з'яў прыроды з фантастычнымі вобразамі багоў і легендарных герояў.

2) Нешта фантастычнае, неверагоднае; вымысел (пераноснае значэнне).

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, пад рэд. Я.Коласа, К.Крапівы, П.Глебкі, Мінск 1977–1984.

**Заданне 10. (0–3)**
Напішы рэзюмэ да тэксту колькасцю 40–60 слоў.

................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................
................................................................................................................................................

**Заданне 11.**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. Ці патрэбныя сучаснаму чалавеку прыклады геройства? Паразважай над праблемай на аснове фрагмента твора Янкі Брыля *Маці* і іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Янка Брыль

***Маці***
(скарочана)

Увечары, вяртаючыся дахаты са сваім наймалодшым, у тое страшнае лета адзіным у хаце сынам, старая ледзь перастаўляла ногі, натруджаныя гадамі бязлітаснай працы. […]

Вось, нечакана спыніўшыся, маці азірнулася на свайго хлопца, які, таксама з сярпом на плячы, пачціва ішоў ззаду, запавальняючы хаду, па-пастушынаму "клюючы" салодкі жытні каласок. […]

На адным слупе, ужо недалёка ад павароту на іхні хутар, старая заўважыла белую плямку паперы – на ўзроўні вачэй. […]

– Што гэта?

– Каб не давалі есці байцам. Каб выдавалі іх паліцаям. Дадуць гарэлкі і тытуню.

– Няхай бы сабе вісела, сынок. Няўжо ж іх нехта паслухае?

– Будуць расстрэльваць тых, хто не паслухае. Усю сям'ю. І хату спаляць.

– На ўсё божая воля...

Яны пайшлі – зноў адно за адным і моўчкі. […]

Маці не спіць.

Каля гэтага хутара фронт – трагічны пачатак вайны – прайшоў, як нейкі раптоўны віхор – і верхам, і нізам. Раўлі самалёты, ірваліся бомбы, грукаталі танкі, беглі па збожжы салдаты... Прайшоў гэты віхор і праз душу: ён нечакана вымеў з хаты абодвух старэйшых сыноў. […]

Так, тых няма. Бог святы ведае, што будзе... А гэты, апошні, не хоча сядзець у хаце, шукае няшчасця. Дачакалася – нават не скажа, куды і чаго...

...Яны прыйшлі яшчэ зацямна. Старая не спала ад болю ў нагах, і асцярожны стук у шыбу не разбудзіў яе, а проста спалохаў. […]

– Хозяин! Хозяин, открой! […]

– Мать? Ты нам хлебушка дай, родная... Ты не бойся: мы сразу же уйдем... Из лагеря бежали...

Шэры і гладкі тэлеграфны слуп са злавесным гудзеннем праплыў перад яе вачыма... З той самай паперкай, якую рваў яе хлопец... Мільганула думка, трывогай тузануўшы за сэрца: а ён яшчэ не вярнуўся!.. […]

– Заходзьце, хлопчыкі! Я вам хоць малачка... Хоць смагу прагнаць... Лямпу не будзем запальваць... […]

І на гасцінцы, і ў мястэчку, на ўсім – так добра знаёмым і якім жа кароткім цяпер – шляху ад роднай хаты да свежай ямы ў лапухах добрыя людзі бачылі яе пакутніцкі паход. І ўсім было зразумела, куды і завошта.

Чатыры босыя, у вайсковых лахманах мужчыны, з рукамі, скручанымі назад калючым дротам, па двух ішлі следам за ёю. Ёй фашысты зрабілі палёгку: не звязалі рук... […] Свае худыя, так мала ў жыцці цалаваныя рукі яна трымала мазалямі да мазалёў. […] І ў ранішнім святле роднага сонца ясным быў яе твар, хоць па маршчынах міжвольна каціліся слёзы. Яна і тут не думала пра сябе. Дзе ён, яе Васілёк, чаму не вярнуўся? Як добра, Божа ласкавы, што ён не прыйшоў, не прыбег нават і на пажар роднай хаты!.. […] Дзе яны, Уладзік і Сцяпан? Хавай іх, Божа, усіх трох ад куль, дай ім усім убачыць матчыну магілу! І тут душа яе вярталася да гэтых, да чужых сыноў, з якімі так моцна зрадніла доля... […] І яна рабіла адно – яшчэ як мама вучыла – малілася. І за сваіх сыноў, і за чужых, і за сябе...[…]

1957

http://knihi.com

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Максім Танк

***Гравюры Скарыны***

Гравюры Скарыны!
Ён выразаў іх
На спаконвечным
Дрэве гісторыі

Свайго народа,
Хоць мог бы падабраць
І больш падатлівы,
І больш удзячны
Матэрыял.
І выразаў ён іх
Не штыхелем-разцом,
А промнем сонца.
Промнем сваёй веры
І любові да народа.
Таму штрых кожны
Быў такі глыбокі,
Што ні агонь,
Ні забыццё,
Ні ворагі,
Ні час
Гравюраў гэтых
Знішчыць
Не змаглі.

І сёння
Нейкая чароўная
Жыве ў іх сіла,
Якая сляпым вяртае зрок,
Глухім – іх слых,
Няпомнячым – іх памяць,
А без’языкім – мову.

М. Танк, *Гравюры Скарыны*, "Звязда", № 203, 5 верасня 1990, с. 1.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 − 3 − 6 | | |
| | B. | 0 − 4 − 6 − 9 − 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 − 2 − 4 − 6 | | |
| | B. | 0 − 4 − 8 − 12 | | |

| | |
|---|---|
| C. | 0 − 1 − 2 |
| D. | 0 − 2 − 4 |
| E. | 0 − 1 − 2 |
| F. | 0 − 1 − 3 |
| G. | 0 − 2 − 4 |
| H. | 0 − 2 − 4 |

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***